ой, маліна», «Ой, пайду я па-над лугам». Калектыў — удзельнік абл. фестывалю «Панямонне жыватворныя крыніцы» (г. Гродна, 2009), раённага свята фальклору «Калі спяваем і гуляем, душою мы адпачываем» (пас. Юбілейны Ваўкавыскага р-на, 2009) і інш. *Н.А.Талашка.*

**МАЦВЯЙЧЎК** Уладзімір Фёдаравіч (н. 10.10.1950, г.п. Шуміліна), дзяржаўны дзеяч Беларусі. Скончыў Магілёўскі пед. ін-т (1975), Мінскую вышэйшую парт. школу (1984). Настаўнічаў. З 1975 на парт. і сав. рабоце ў Магілёўскай вобл. З 1988 дырэктар Полацкага ПТВ хімікаў №233, з 1995 дырэктар па кадрах і ідэалагічнай рабоце ААТ «Полацк-Шкловалакно» канцэрна «Белнафтахім». З 2004 старшыня Нац. дзярж. тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь. З 2005 міністр культуры Рэспублікі Беларусь. З 2009 памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. З 2011 кіраўнік Сакратарыята Старшыні Вышэйшага Дзярж. Савета Саюзнай дзяржавы.

**МАЦЕ́Й**, Майсей, Мурын, Мурун, прысвятак беларускага народнага календара. Адзначаецца 10 вер., 29 ліст., 24 лют. М. лічыўся збавіцелем ад п'янства. У народзе казалі: «Майсей Мурун — сцаліцель ад п'янства», «Пасля Мацея мужык на полі не пацее», «На Мацея дарога (зіма) пацее». У царк. календары супадае з днямі памяці прападобнага Майсея Мурына (330—405) і св. апостала і першага евангеліста Матфея.

*Літ.:* Лозка А. Беларускі народны каляндар. Мінск, 2002.

*А.Ю.Лозка.*

**МАЦІЕ́ВІЧ** Алег Мікалаевіч (н. 30.6.1949, г. Магілёў), беларускі мастак. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1966). З 1976 выкладаў у Мінскім маст. вучылішчы, у 1990—2008 у Бел. акадэміі мастацтваў. Працуе ў розных жанрах станковага жывапісу. Творам уласцівы ўпарадкаванасць кампазіцыі, свабода і абагуленасць пісьма, каларыстычная згарманізаванасць, празрыстасць фарбаў, глыбіня прасторы. Сярод асн. работ: сюжэтна-тэматычныя карціны «Рыбакі на Прыпяці» (1987), «Бакеншчык» (1996), «Вяселле» (1997), «22 чэрвеня» (2001), «На доўгую памяць» (2008), «Мірнае лета» (2010), «Паветраная трывога» (2014); партрэты «Партрэт маці» (1973), «Аўтапартрэт» (1975), «Юля», «Ірына» (абодва 1985), «Мастак Рыгор Сітніца» (1986), «Паэт Р.Барадулін» (1987), «Паэт Л.Дранько-Майсюк» (1988), «Гісторык і пісьменнік У.Арлоў» (1989), «Партрэт сына» (1995); пейзажы «У асеннім садзе» (1982), «Ноч у Жыровічах» (1991—92), «Пейзаж з козамі» (1989), «Вечар» (2004), «Лепельскія азёры» (2006); нацюрморты «Сухія кветкі» (1970), «Нацюрморт з кветкамі» (1972), «Нацюрморт з пеўнікам» (1976), «Нацюрморт з лямпамі» (1989), «Сялянскі нацюрморт» (1990). *Г.А.Фатыхава.*

**«МА́ЦІ-ПТЎШКА»**, баладны сюжэт пра падзеі, звязаныя з татарскімі набегамі, палонам, здзекамі, забойствам, стратай дзяцей. Замалёўкі гіст. рэалій у творы — фон для раскрыцця драматычных лёсаў простых людзей. Балада пабудавана па класічных законах трагедыі. Уступ — эпічнае апавяданне пра маці, у якой тры дачкі пайшлі ў лес па ягады і не заўважылі, як пачало змяркацца. Здараецца так, што старэйшая дачка ўтапілася, сярэднюю звяры з'елі, а малодшую татары звялі ў палон. Маці шкадуе толькі малодшую, што «навек з родам разлучылі». Завязка дзеяння пачынаецца з пераўвасаблення маці ў зязюлю: «Ой, скінуся я зязюлькаю, // Ой, скінуся я шэранькаю, // Да паля-



*А.Мацievіч.* *Мастак Рыгор Сітніца. 1986.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

чу ў татарскі сад, // Да сяду на татарскім саду, // Закукую вельмі галосна, // Да заплачу вельмі жаласна». Пасля апісання быту татараў развіццё дзеяння паскараецца і твор становіцца больш эмацыянальна напружаным. Урэшце паланянка выбірае смерць замест няволі. Фінал твора прасякнуты разуменнем мужнасці ўчынку дзяўчыны нават яе ворагамі. Маці татарына загадвае сыну: «Пахавай яе, сынок, на высокай гары, // Каб ёй былі відны мацерыны краі». Балада пра паланянку — узор патрыятызму, любові да роднага краю, вольналюбства нашага народа.

*А.М.Аляхновіч.*



*Л.Мацісава ў ролі Зоські.*

**МАЦІ́САВА** Лізавета Парфенаўна (17.9.1916, г. Магілёў — 20.1.1990), беларуская актрыса. Засл. артыстка Беларусі (1955). Скончыла драм. студыю Тэатра юнага гледача БССР (1936). У 1937—72 (з перапынкамі) працавала ў тэатрах муз. камедыі Беларусі. У 1951—69 у Бел. тэатры імя Я.Коласа. Актрыса выразнай пластыкі, музыкальнасці. Пры абмалёўцы сваіх персанажаў карысталася мяккімі, лірычнымі фарбамі. Сярод роляў аперэтных гераінь: Старая («Пяе «Жаваранак» Ю.Семянякі), Пепіта («Вольны вецер» І.Дунаеўскага), Ірынка («Вяселле ў Малінаўцы» Б.Аляксандрава), Этэлька («Каламбіна» А.Рабава), Молі («Гейша» С.Джонса), Марыета, Ангільта («Баядэра», «Сільва» І.Кальмана), Ванда («Блакітная мазурка» Ф.Легара). Лепшыя з партый драм. і характарнага плана: Зоська («Раскіданае гняздо» Я.Купалы), Сцепаніда («Праўда і крыўда» паводле М.Стэльмаха), Галіна Адамаўна («Сэрца на далоні» паводле І.Шамякіна), Галя («У бэзавым садзе» Ц.Саладара), Юлія, Людміла («Дачнікі», «Васа Жалязнова» М.Горкага), Ніна Гарошына («Часовы жылец» У.Палякова), Фларэла («Настаўнік танцаў» Лопэ дэ Вегі), Луэла («Гарачае лета ў Берліне» Д.К'юсак), Лізавета («Марыя Сцюарт» Ф.Шылера), Рэгана («Кароль Лір» У.Шэкспіра) і інш.

**МАЦІСО́Н** Міхаіл Фёдаравіч (17.9.1881, г. Балагое Цвярской вобл., Расія — 25.6.1940), беларускі музыказнавец, хормайстар, кампазітар. Скончыў Маскоўскае сінадальнае вучылішча. У 1924—32 выкладаў у Бел. муз. тэхнікуме, з 1932 у Бел. кансерваторыі. Аўтар «Спеўніка дзеля двух- і трохгалосых дзіцячых хароў» (1925), дапаможніка «Пачатковая тэорыя музыкі» (1933), раманса «Слуцкія ткачыхі» на вершы М.Багдановіча, апрацовак бел. песень і інш.

**МАЦКЕ́ВІЧ** Вячаслаў Канстанцінавіч (н. 1.1.1944, в. Утканы Воранаўскага р-на), беларускі педагог, музыкант, фальклдарыст. Засл. работнік культуры Беларусі (1990). Скончыў Гродзенскае муз.-пед. вучылішча (1965), Ленінградскі ін-т культуры (1976). З 1965 настаўнічаў. З 1968 у Воранаўскай дзіцячай школе мастацтваў (у 1977—2009 дырэктар). З 1982 кіраўнік *Воранаўскага народнага ансамбля народнай музыкі і песні «Лявоны»*. У творчай дзейнасці вял. ўвагу надае пошуку, захаванню і папулярызацыі малавядомых твораў нар. творчасці рэгіёна.

*В.В.Давідовіч.*

**МАЦКЕ́ВІЧ** Іван Іванавіч (н. 9.4.1947, в. Грабава Ваўкавыскага р-на), беларускі акцёр. Засл. артыст



*І.І.Мацкевіч.*

Беларусі (2011). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1968). З 1968 працаваў у Брэсцкім абл. драм. тэатры. З 1981 у Тэатры-студыі кінаакцёра, з 1996 у Нац. акадэмічным драм. тэатры імя М.Горкага. Характарны, самабытны акцёр з яркім нац. каларытам. Яго творчасць вызначаецца глыбінёй спасціжэння нар. характару, умен-



*І.Мацкевіч у ролі Прохара Жалязнова.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ